**Кароткі змест Лірыка**

**ДЗЯКУЙ ТАБЕ, БРАЦЕ, БУРАЧОК МАЦЕЮ...**

Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею,

За тое, што ў сэрцы збудзіў ты надзею,

Што між братоў нашых знаходзяцца людзі

З кахаючым сэрцам і баляшчай грудзяй.

Дзякуй табе, браце, і за тыя словы,

Што ўспомнілі звукі нашай роднай мовы.

Бяры, браце, дудку, наладзь і жалейку,

Няхай песнь смутная ідзе ў калейку

І будзіць у сэрцаў мысль аб лепшай долі,

Якой мы не знали дагэтуль ніколі.

У вершы «Перш душылі паны...» А. Гурыновіч з іроніяй гаворыць пра тыя «змены», якія адбыліся ў парэформенны перыяд, калі ў расійскай дзяржаве пачаў усталёўвацца капіталізм:

Перш душылі паны,

Што шляхтай зваліся,

Цяпер «сукіны сыны»

За нас узяліся.

Ні адны, ні другія нічога не далі, толькі «нашу працу ў свой кішэнь пакавалі». Аўтар заклікае «ўсім сабрацца кучай». Аб'яднаўшыся, яны стануць хмарай, з якой пральецца дождж —

У нашай злой долі

Дух падыме у нас,

Як рунь у тым полі.

Як гром з гэтай хмары, «загручыць усім паном загуба ў вочы!»

Верш «Бор» рытмічнай арганізацыяй, вобразнай сістэмай блізкі да фальклору. Звяртаючыся да бору, аўтар зазначае:

Мы з табой раслі

Уздымаліся,

На адной зямлі

Гадаваліся.

Мы зжылісь з табой,

Бор наш родненькі,

Як з сваёй сумой

Жабрак голенькі.

Побач з вобразам бору ў вершы паўстае вобраз народа, у якога няма «долі — шчасценька», які жыве ў нястачы і беднасці.

А  на нашых людзях —

Усё  сярмяжачкі,

А  у іх кішанях —

Ні  бумажачкі —

піша А. Гурыновіч.  Аднак услед за гэтым выказвае спадзяванне, што «не будзе ж так векі вечныя»,  што некалі прыдуць «часы лепшыя!»